# БЕЛАРУСЬ У 1950-1990-я гг.

# 1. Спробы дэмакратызацыі грамадства ў гады “адлігі” (1954-1964 гг.)



5 сакавіка
1953 г.
памірае
І. Сталін

# Барацьба за ўладу пасля смерці І. Сталіна

| ЗАХАВАННЕ СТАЛІНСКАЙ СІСТЭМЫ | РЭФОРМА СТАЛІНСКАЙ СІСТЭМЫ |
| --- | --- |
| К. Варашылаў<br>В. Молатаў<br>Л. Кагановіч | Л. Берыя (растраляны ў 1953)<br>Г. Маленкоў (зняты з пасады)<br>**М. Хрушчоў (з 13.09.1953 Першы сакратар ЦК КПСС, з 27.03. 1958 Старшыня СМ СССР)** |

1956 г. – XX з’езд партыі, даклад М. Хрушчова **“Аб кульце асобы і яго наступствах”**

***Дэсталінізацыя і дэмакратызацыя грамадства:***

- - вызваленне большасці асуджаных з ГУЛАГу
- - пачатак рэабілітацыі ахвяр сталінскіх рэпрэсій (каля 700 тыс.)
- - змяншэнне цэнзурнага кантролю ў СМІ і мастацтве
- - дэмантаж помнікаў Сталіну і перайменн

***Супярэчнасці:***

- Крытыка Сталіна, але не сістэмы

- Умацаванне ўлады Хрушчова



У грамадска-палітычным жыцці час праўлення М. Хрушчова атрымаў назву **«адліга»**, якая наступіла пасля доўгай сталінскай зімы»:

- - дазвол друкаваць творы паэтаў і пісьменнікаў, забароненых пры Сталіне
- - большая адкрытасць СССР свету – 1957 г. – сусветны фестываль моладзі і студэнтаў у Маскве
- - новыя тэндэнцыі ў літаратуры, кіно, тэатры («шасцідзесятнікі»)



І. Эрынбург






# Антырэлігійная і нацыянальна палітыка

- Закрыццё і разбурэнне храмаў (*Фара Вітаўта ў Гродна*)
- Атэістычнае выхаванне моладзі (*забарона наведвання набажэнстваў моладзі да 18 г.*)
- Узмацненне русіфікацыі: перавод адукацыі на рускую мову, газет, перадач радыё, тэлебачання
- Ідэя зліцця нацыяў у адзіны савецкі народ і адмаўленне ад нацыянальных культур (*М. Хрушчоў: «Чым хутчэй мы пачнем гаварыць па-руску, тым хутчэй пабудуем камунізм»)*
- Пераслед нацыянальна арыентаваных дзеячаў (*артыкул Б. Сачанкі «Шанаваць родную мову, 1957 г.*)






# Гаспадарчыя рэформы




- 1957 г. Дэцэнтралізацыя кіравання эканомікай і перабудо кіравання прамысловасцю з ***галіновага прынцыпу на тэрытарыяльны***: (*ліквідаваліся 10 міністэрстваў і ствараліся тэрытарыяльныя органы –* ***саўнаргасы)***. 1962 г. узбуйненне саўнаргасаў.



**Вынік**: рэформы не прынеслі кардынальных паляпшэнняў эканоміцы, а толькі ўзмацнілі прамыслова-кіраўнічую блытаніну.



- ***НТР: развіццё неметалаёмкіх галін прамысловасці БССР*** – прыборабудаванне і электроніка, хімічная прамысловасць (ускладненне экалагічнай сітуацыі), энергетыка
- ***Сацыяльная пераарыентацыя прамысловасці*** – павелічэнне аб’ёмаў вытворчасці тавараў народнага

# Сельская гаспадарка

**<u>1953 – 1958 гг.:</u>**
***ажыўленне сельскагаспадарчай вытворчасці***:
-Павелічэнне закупачных коштаў;
-Спісанне запазычанасцяў, памяншэнне падаткаў з калгаснікаў і іх адмена (1958);
-Засваенне цаліных земляў;
-Умацаванне МТБ;
-Пашырэнне

**<u>1959 – 1964 гг.:</u>**
***умацаванне адміністрацыйнага ціску на аграрны сектар***:
-Ліквідацыя МТС і продаж тэхнікі калгасам;
-Узбуйненне калгасаў, стварэнне буйных аграгаспадарак;
-Неабгрунтаванае пашырэнне пасеваў кукурузы і заданні па заготоўцы мяса;
-Ганенні на падсобныя сялянскія гаспадаркі (у БССР амаль не было)






# Сацыяльная палітыка

- Павышенне мінімальнага заробку на 35%;
- Павелічэнне памераў пенсій у 2 разы
- Разгортванне масавага жыллёвага будаўніцтва («хрушчоўкі»);
- Увядзенне грашовай аплаты працы калгаснікаў;
- Устанаўленне 7-гадзіннага рабочага дня;
- Адмена платы за навучанне;
- Урбанізацыя, працоўная міграцыя ў гарады



# Вынікі гаспадарчых рэформ

- Рэзкае пагаршэнне эканамічнай сітуацыі
- Падзенне сельскагаспадарчай вытворчасці
- Пагаршэнне забеспячэння прадуктамі харчавання і рост коштаў
- Зніжэнне тарыфных расцэнкаў на вытворчасці
- Імпарт збожжа





# 2. Грамадска-палітычнае жыццё і развіццё гаспадаркі БССР у гады “застоя” (1965 – 1985 гг.)

- На пленуме ЦК КПСС у 1964 г. **М. С. Хрушчоў** быў абвінавачаны ў “валюнтарызме і суб’ектывізме” і зняты з пасады Першага сакратара ЦК КПСС.
- Генеральным сакратаром (1966) ЦК КПСС быў выбраны **Л.І. Брэжнеў**. Старшынёй Савета Міністраў СССР стаў **А.М. Касыгін.**
- Змянілася і кіраўніцтва БССР пасаду першага сакратара ЦК КПБ замест **К.Т. Мазурава**











# Перыяд 1965-1985 гг. атрымаў назву “застой”

✔ ***Зварочванне працэсаў дэсталінізацыі і дэмакратызацыі грамадства:***

- **Спыненне працэсу рэабілітацыі рэпрэсаваных** (каля 200 чал.)
- **Узмацненне цэнзуры** (*пастанова ЦК КПСС “Аб павышэнні адказнасці кіраўнікоў органаў друку, радыё, тэлебачання, кінематаграфіі, устаноў культуры і мастацтва за ідэйна-палітычны ўзровень публікуемых матэрыялаў і рэпертуару”, 1969*)
- **Пашырэнне прымянення артыкулаў Крымінальнага кодэксу за антысавецкую прапаганду, захаванне і распаўсюджванне літаратуры такога зместу**
- **Замоўчванне і адсутнасць крытыкі**






**<u>Вынік:</u>** з’яўленне **дысідэнцкага руху** – супрацьстаянне савецкай ідэалогіі без гвалтоўных метадаў барацьбы.

- ✔ Формы – індывідуальны супраціў, падпольныя гурткі і асяродкі, самвыдат
  -  ***Агульнадэмакратычная плынь*** – (А. Сахараў, А. Салжаніцын), М. Кукабака, група Ханжанкова



А. Сахараў




М. Кукабака



С. Хажанкоў

- ***Нацыянальная плынь*** – акадэмічны асяродак (М.Чарняўскі, З.Пазняк), асяродак “На Паддашку” (Я.Кулік, А. Марачкін), “Беларуская майстроўня” (С. Дубавец, Г.Мацур)



З. Пазняк




Беларуская майстроўня

- ***Рэлігійная плынь*** – Э.Сабіла (баптызм), У.Чарняўскі (каталіцтва), В.Данілаў (уніяцтва)



кс. У. Чарняўскі



- Метады барацьбы з дэсідэнцтвам – высылка, турэмнае зняволенне, прымусовая псіхіятрыя, звальненне з працы, вучобы, пазбаўленне савецкага грамадзянства




7 чалавек, якія выйшлі на Чырвоную плошчу ў Маскве 23.08.1968 г. супраць увядзення савецкіх войскаў у Чэхаславакію







**Сообщение ТАСС**

Указом Президиума Верховного Совета СССР за систематическое совершение действий, не совместимых с принадлежностью к гражданству СССР и наносящих ущерб Союзу Советских Социалистических Республик, лишен гражданства СССР и 13 февраля 1974 года выдворен за пределы Советского Союза Солженицын А. И.

Семья Солженицына сможет выехать к нему, как только сочтет необходимым.

## ✔*Замацаванне ўлады партыйнай наменклатуры (прывілеяваны клас савецкага грамадства)*

- Кантроль партыі над саветамі, прафсаюзамі, камсамолам
- Прывілеі наменклатуры ў размеркаванні матэрыяльных каштоўнасцяў
- Пратэкцыянізм і карупцыя
- ***Герантакратыя*** – сталы ўзрост і слабое здароўе кіраўнікоў (сярэдні узрост членаў Палітбюро – 62 гады).

**<u>Вынік:</u>** Зніжэнне даверу народу да партыі і рост абыякавасці да савецкай ідэалогіі











Л. Брэжнеў і Э.
Хонекер


ГОСПОДИ! ПОМОГИ МНЕ ВЫЖИТЬ
СРЕДИ ЭТОЙ СМЕРТНОЙ ЛЮБВИ.
MEIN GOTT, HILF MIR, DIESE TÖDLICHE LIEBE ZU ÜBERLEBEN
pikabu.ru

✔ ***Адсутнасць сур’ёзных узрушэнняў у палітычным жыцці краіны, сацыяльная стабільнасць і высокі ўзровень жыцця;***

- паляпшэнне матэрыяльнага становішча (жыллёвае пытанне, рост даходаў)
- рост спажывецкіх адносін да рэчаіснасці

**<u>Вынік:</u>** пашырэнне негатыўных з’яў – п’янства, наркаманіі, марнатраўства, крадзежу дзяржаўнай уласнасці, дэфіцыту і спекулянства









# Канстытуцыі СССР 1977 г. і БССР 1978 замацавалі кіруючую ролю КПСС і канцэпцыю “развітога сацыялізму”




**Дэкларавалася:**

1. Высокі эканамічны патэнцыял
2. Поўнае панаванне дзяржаўнай уласнасці
3. Адзінства савецкага народа
4. Вядучая і накіроўваючая роля партыі, як “партыі усяго народа”

**Рэальнае становішча:**

1. Асутнасць мадэрнізацыі гаспадаркі, нарастанне тэхнічнага і тэхналагічнага адставання ад капіталістычных краін
2. Незацікаўленасць працоўных у выніках сваёй працы, сацыяльная ўраўнілаўка, “ценевая эканоміка”
3. Ігнараванне этнічнай разнастайнасці народаў СССР, татальная русіфікацыя
4. Вынішчэнне

# Эканамічныя рэформы 1965 г. (“касыгінскія”)

***Мэты:***



- Павелічэнне тэмпаў развіцця і павышэнне ўзроўню жы
  насельніцтва
- Пераход ад экстэнсіўнай да інтэнсіўнай мадэлі эканомі

***Прамысловасць:***

- Скарачэнне планавых паказнікаў са 100 да 8
- Ацэнка эфектыўнасці працы прадпрыемства па аб’ёму рэалізацыі прадукцыі
- Павышэнне самастойнасці прадпрыемстваў , гаспадарчы разлік
- Стварэнне на прадпрыемствах грашовых фондаў для развіцця вытворчасці, матэрыяльнага стымулявання, сацыяльнага забеспячэння
- Змена сістэмы кіравання вытворчасцю – ліквідацыя саўнаргасаў і аднаўленне міністэрстваў.



# *Сельская гаспадарка:*



- Цвёрды і нязменны план на 5 гадоў для кожнага суб’екта гаспадарання
- Павышэнне закупачных коштаў на с/г прадукцы ў 1,5-2 разы, 50% надбаўка за звышпланавую прадукцыю
- Умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы калгасаў
- Павышэнне самастойнасці калгасаў, элементы гаспадарчага разліку
- Зняцце абмежаванняў на ўтрыманне ўласных гаспадарак
- Спецыялізацыя с/г па зонах і ўнутры раёнаў, стварэнне адзінага аграпрамысловага комплек рэспублікі.
- Разгортванне меліярацыйных работ і павелічэнне пасяўных плошчаў



# Вынікі рэформы




- 8-я пяцігодка (1966-1970) стала самай паспяховай за ўвесь час існавання СССР (“залатая пяцігодка”)
- У БССР уведзена ў эксплуатацыю 78 буйных прадпрыемстваў, 222 вытворчых і навукова-вытворчых аб’яднанняў (оптыка-механічнае аб’яднанне і інш.)
- Вызначальны напрамак набылі энергетыка, машына- і прыборабудаванне, хімія і нафтахімія, электроніка і радыёэлектрон вытворчасць мінеральных угнаенняў
- Сельская гаспадарка стала рэнтабельна



# Згортванне рэформ

- Адсутнасць падтрымкі рэформ сярод партыйнага кіраўніцтва, перамога кансерватыўнага крыла
- Прыярытэт ідэалогіі над эканамічнымі метадамі, нежаданне рэфармаваць камандна-адміністрацыйную сістэму
- Экспарт энерганосбітаў і магчымасць забяспечваць матэрыяльны ўзровень жыцця насельніцтва без структурных рэформ
- **<u>Вынік:</u>** зніжэнне тэмпаў і тармажэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця,






# Нарастанне крызісных з’яў

- У пач. 80-х гг. крызіс у с/г: не расла ўраджайнасць, страты прадукцыі пры ўборцы, транспарціроўцы і захоўванні (20-49%)
- Абвастрэнне харчовай праблемы: рост закупак харчавання за мяжой, увядзенне нарміраванага спажывання
- Стварэнне Аграрна-прамысловага комплексу СССР (Белаграпрам) і прыняцце Харчовай праграмы (1982) – не выканалі сваёй функцыі
- Рост даходаў не забяспечваўся адпаведным ростам выпуску тавараў народнага спажывання, што прыводзіла да дэфіцыту, чэргаў, росквіту ценявой эканомікі
- Пагаршэнне экалагічнага становішча ў












МЯСО

# СССР на міжнароднай арэне




- **2-я пал. 60-х** – абвастрэнне канфрантацыі з Захадам (вайна ў В’етнаме (1964-1975), увод войск у Чэхаславакію (1968), канфлікт з Кітаем (1969))






- **к. 60 – 1 пал. 70-х гг.** – міжнародная разрадка, паляпшэнне адносін СССР з Захадам, спыненне гонкі ўзбраенняў (дагавор аб прадухіленні ядзернай вайны, сумесны касмічны прект СССР і ЗША (Саюз-Апалон), усталяванне адносін з ФРГ)



- **к. 70 – 1 пал. 80-х гг.** – абвастрэнне канфрантацыі (“экспарт рэвалюцыі”, вайна СССР у Афганістане (1979-1989гг.))

# 3. Палітыка “перабудовы”. Распад СССР (1985-1991 гг.)

- 1982 г. – памірае Л.І. Брэжнеў
- Генеральным сакратаром ЦК КПСС становіцца **Ю.У. Андропаў**, пачынаецца барацьба з карупцыяй і ўмацаванне дысцыпліны, нарастае канфрантацыя з Захадам
- У 1984 г. кіраўніком краіны становіцца **К.У. Чарненка**, кароткі перыяд вяртання “застою”
- У 1985 г. Генеральным сакратаром ЦК КПСС выбраны самы малады член Палітбюро **М.С.**









# Мэты “перабудовы”




- Дэмакратызацыя палітычнай сістэмы і грамадства.
- Рэфармаванне эканомікі, “паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця”.
- Разрадка ў знешняй палітыцы, спыненне гонкі ўзбраенняў.






# Мерапрыемствы

- Палітыка галоснасці і дэмакратызацыі – стварэнне сацыялізму “з чалавечым тварам”
- Адмена цэнзуры (друкуюцца забароненыя пісьменнікі, дэсідэнты)






- Аднаўленне працэсаў “дэсталінізацыі”
  - рэабілітацыя ахвяр сталінскіх рэпрэсій – 130 тыс.
  - 14.06.1988 створана урадавая камісія па расследаванню месца масавага растрэлу у Курапатах





- Абуджэнне нацыянальнай свядомасці, цікавасць да мовы, гісторыі і культуры. Таварыствы “Талака”, “Паходня”, “Узгор’е”





- У 1987-89 гг. адбываецца палітызацыя дзейнасці грамадскіх арганізацый, яны выступаюць з крытыкай палітыкі ўладаў
- **30.10.1988** – “Дзяды” – масавае шэсце у Курапаты, якое было разагнана уладамі
- 1989 – стварэнне Беларускага народнага фронту







- Адмена артыкула аб кіруючай ролі КПСС
- Стварэнне пастаяннага парламента Вярхоўнага Савета СССР (1989) і Вярхоўнага савета БССР (1990) на альтэрнатыўнай аснове (на 310 месцаў 1769 кандыдатаў), увядзенне пасады Прэзідэнта СССР (1990) і выбары М.С. Гарбачова
- Старшыня Вярхоўнага Савета БССР – **М. Дземянцей**



**Мікалай Дземянцей**

У парламенце фарміруецца апазіцыйная фракцыя (дэпутаты ад БНФ)

- **27 ліпеня 1990** Вярхоўны савет БССР прымае **Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР**
- *Беларусь абвяшчалася суверэннай дзяржавай, атрымала права на стварэнне ўласнага нацыянальнага банка і грашовай сістэмы, сваіх узброеных сілаў, права на заключэнне добраахвотных саюзаў з іншымі дзяржавамі.*
- Дата прыняцця гэтай Дэкларацыі была абвешчана Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь



196

# ДЭКЛАРАЦЫЯ

## Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі,

выяўляючы волю народа Беларускай ССР,

усведамляючы адказнасць за лёс беларускай нацыі,

пацвярджаючы павагу годнасці і правоў людзей усіх нацыянальнасцей, якія жывуць у Беларускай ССР,

сведчачы павагу да суверэнных правоў усіх народаў Саюза ССР і свету,

лічачы рэспубліку паўнапраўным і незалежным членам сусветнага супольніцтва,

дзейнічаючы ў адпаведнасці з прынцыпамі Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і іншымі агульнапрызнанымі міжнародна-прававымі актамі,

урачыста абвяшчае поўны дзяржаўны суверэнітэт Беларускай ССР як вяршэнства, самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады рэспублікі ў межах яе тэрыторыі, правамоцнасць яе законаў, незалежнасць рэспублікі ў знешніх зносінах і заяўляе аб рашучасці стварыць прававую дзяржаву.

Артыкул I

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка — суверэнная дзяржава, якая ўстаноўлена на аснове ажыццяўлення беларускай нацыяй яе неад'емнага права на самавызначэнне, дзяржаўнасці беларускай мовы, вяршэнства народа ў вызначэнні свайго лёсу.

Неад'емныя правы Беларускай ССР як суверэннай дзяржавы рэалізуюцца ў адпаведнасці з агульнапрызнанымі нормамі міжнароднага права. Беларуская ССР ахоўвае і абараняе нацыянальную дзяржаўнасць беларускага народа.

- Абвастрэнне міжнацыянальных адносін у СССР і “парад суверэнітэтаў” (1988-1991) – прыярытэт рэспубліканскага заканадаўства над саюзным
- Патрэба ў вырашэнні далейшага лёсу СССР
- **17.03.1991** – Усесаюзны рэферэндум аб захаванні СССР
- За захаванне Саюзу ў абноўленай форме (Саюз Суверэнных Дзяржаў) выказалася 76%, у БССР – 82,7%
- Падпісанне новага Саюзнага дагавору было прызначана на **20 жніўня 1991 г.**



БЮЛЛЕТЕНЬ

для голосования на референдуме СССР

17 марта 1991 года

Считаете ли Вы необходимым сохранение Союза Советских Социалистических Республик как обновленной федерации равноправных суверенных республик, в которой будут в полной мере гарантироваться права и свободы человека любой национальности.

Оставьте один из указанных ответов, другой вычеркните

ДА НЕТ

Бюллетень в котором при голосовании вычеркнуты слова ДА и НЕТ или не вычеркнуты оба слова, признается недействительным.



- **19.08.1991** частка кіраўніцтва КПСС арганізавала спробу дзяржаўнага перавароту, мэта якога захаванне СССР і адхіленне ад улады прэзідэнта СССР М.С.Гарбачова
- Быў створаны Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы (ГКЧП), які абвясціў сябе ўладай і ўвёў надзвычайнае становішча
- **21 жніўня** канстытуцыйная улада была адноўлена, а КПСС забаронена








- **25.08.1991** – прыняты Закон “Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце БССР”
- **19.09.1991** – законы
  - “Аб назве БССР” – Рэспубліка Беларусь
  - “Аб дзяржаўным сцягу”
  - “Аб дзяржаўным гербе”





- Першым кіраўніком незалежнай Рэспублікі Беларусь стаў Старшыня Вярхоўнага Савета **С.С. Шушкевіч**
- Прэм’ер-міністрам (кіраўнік ураду) – **В.Ф. Кебіч**



**С. Шушкевіч**



**В. Кебіч**

- **7-8.12.1991** – кіраўнікі Расіі (Б.Ельцын), Украіны (Л.Краўчук) і Беларусі (С.Шушкевіч) падпісалі пагадненне аб спыненні існавання СССР і стварэнні СНД (Садружнасць Незалежных Дзяржаў)



# Этапы эканамічнага рэфармавання

1. <u>**1985-86 (паскарэнне)**</u>

1) Выкарыстанне “скрытых рэзерваў”
(*максімальная загрузка вытворчых магутнасцяў, шматзменная праца; умацаванне працоўнай дысцыпліны; прапановы рацыяналізатараў; развіццё сацспаборніцтва*).

2) Антыалкагольная кампанія.

3) Барацьба з “непрацоўнымі даходамі”

4) Дзяржпрыёмка.

<u>**Вынік:**</u> рост колькасці аварый, скарачэнне даходаў ад продажу спіртнога, павелічэнне адміністрацыйнага апарату






# 26 красавіка 1986 – аварыя на Чарнобыльскай АЭС



- 23% тэрыторыі БССР забруджана
- Выведзена з абароту каля 20% с/г угоддзяў
- Ліквідавана 415 населеных пунктаў
- Агульныя страты: 32 гадавыя бюджэты БССР

## 2. 1987-89 (увядзенне элементаў рынку)

- Пашырэнне самастойнасці прадпрыемстваў, пераход на гаспадарчы разлік і самафінансаванне
- З’яўленне прыватнага сектару (кааперацыя)
- Арэнда зямлі і ўвядзення новых форм гаспадарання у с/г (агракамбінаты, фермерства)
- Скарачэнне выдаткаў на ВПК
- Скарачэнне міністэрств і ведамств
- Адмена манаполіі дзяржавы на знешнеэканамічную дзейнасць (СП)







BELWEST

**Вынікі:** легалізацыя “ценявой эканомікі”, таварны голад, увядзенне талонаў,

## 3. 1989-1991 (пераход да рынку)

- Паэтапная прыватызацыя
- Абмежаванне эканамічнай улады цэнтра

**Вынікі:** развал эканамічных сувязяў паміж рэспублікамі, рост інфляцыі, беспрацоўя, збядненне насельніцтва

**Асаблівасці Беларусі:** больш мягкая форма негатыўных працэсаў за кошт назапашанага патэнцыялу.





# “Новае палітычнае мысленне”

- Змена знешнепалітычнага курсу СССР, адыход ад канфрантацыі з Захадам
- Курс на раззбраенне
- Вывад войск з Аўганістана (1989)
- Аб’яднанне ФРГ і ГДР (1990)
- **Вынік**: канец «халоднай вайны





# Вынікі “перабудовы”

***пазітыўныя***

- Разбурэнне таталітарнай сістэмы
- Замацаванне палітычных свабод і свабоды сумлення
- Стварэнне пастаяннага парламента
- Пачатак дэмілітарызацыі краіны
- Ліквідацыя гонкі ўзбраенняў і ваеннага супрацьстаяння дзяржаў

***негатыўныя***

- Абвастрэнне міжнацыянальных супярэчнасцяў у СССР
- Пагаршэнне сацыяльна-эканамічнага становішча насельніцтва
- Паслабленне ўлады ў цэнтры і на месцах
- Парушэнне эканамічных сувязяў паміж рэспублікамі
- Паслабленне абараназдольнасці ўсіх рэспублік

# 4. Адукацыя і навука БССР ў 1944-1985 гг.

# сяр. 40 – сяр. 50-х гг.

- Аднаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі і навукі
- Недахоп настаўнікаў, выкладчыкаў, вучоных
- Да 1950 г. адноўлена сетка сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, створана наноў у Заходняй Беларусі
- Пераход да ўсеагульнага 7-гадовага навучання
- Стварэнне вячэрніх школ рабочай і сельскай моладзі
- Вяртаюцца з эвакуацыі і аднаўляюць працу ВНУ – БДУ, педінстытуты, кансерваторыя, БПІ, медыцынскі інстытут
- Ствараюцца новыя ВНУ – Беларускі тэатральны інстытут (1945), Мінскі дзяржаўны інстытут замежных моў (1948), (29 ВНУ у 1950 г. у БССР).
- Заідэлагізаванасць навукі, дзяленне на “сацыялістычную” і “капіталістычную”
- Тэндэнцыя – скарачэнне навучання на беларускай мове, выкараненне

# сяр. 50 – сяр. 60-х гг.

- 1958 г. – рэформа адукацыі па увядзенню політэхнічнага навучання і працоўнага выхавання.
- 1959/60 гг. – ператварэнне сямігодак у васьмігодкі, сярэдніх 10-гадовых у 11-гадовыя з вытворчым навучаннем (з 1964 вяртанне назад), стварэнне пры школах майстэрняў
- 1959 г. – Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР
- Стварэнне новых ВНУ
- Узмацненне русіфікацыі – вывучэнне беларускай мовы на выбар бацькоў, поўная русіфікацыя ВНУ

- Павелічэнне асігнаванняў, рост колькасці навуковых установ і навуковых работнікаў, асваенне космасу, атамная энэргетыка
- Вядучая роля – Акадэмія навук БССР (*стварэнне новых інстытутаў і навуковых накірункаў*).
- Галіновая навука – аўтаматызацыя і рабатызацыя прамысловасці
- **Тэндэнцыі** - слабое пранікненне навуковых дасягненняў у прамысловасць, ідэалагічныя абмежаванні развіцця сацыяльна-







# сяр 60 – 80-я гг.

- Увядзенне трохгадовай пачатковай адукацыі, усеагульнай сярэдняй адукацыі
- Павелічэнне колькасці ВНУ да 33, колькасці выпускнікоў у 3 разы (ад 1950 г.)
- Дэнацыяналізацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу, нігілізм у адносінах да мовы і культуры
- Высокія дасягненні ў галіне матэматыкі, оптыкі, спектраскапіі, паўправаднікоў (35 дзяржпрэмій СССР)